Дыялог пакаленняў

# «ТРЭБА ЖЫЦЬ СВАІМ РОЗУМАМ»

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася са студэнтамі БДУ

**Сустрэчы з моладдзю даўно ўжо сталі не толькі адной з форм работы членаў верхняй палаты парламента, але і добрай і карыснай традыцыяй. Дзякуючы такім размовам, маладыя людзі літаральна з першых вуснаў атрымліваюць вычарпальную інфармацыю аб дзейнасці ўлады і прыярытэтах развіцця краіны. А самае галоўнае — тая інфармацыя дакладная, аб'ектыўная і праўдзівая ў адрозненне ад рознага кшталту фэйкаў аб нашай краіне, што распаўсюджваюцца ў сеціве.**

Дарэчы, пра тое, што карыстацца трэба толькі праверанай інфармацыяй з надзейных крыніц, гаварыла і Наталля Качанава. Яна адзначыла, што зусім не варта чытаць, а тым больш падпісвацца на інфармацыйныя рэсурсы, якія прызнаны экстрэмісцкімі. «У нас прававая дзяржава і ўсё робіцца па законе... Таму не трэба парушаць яго па сваім легкадумстве. Тыя, хто пакінуў краіну і цяпер «палівае» яе з-за мяжы, — ці варты яны таго, каб да іх прыслухоўвацца, ці варты яны павагі ўвогуле?» — звярнулася да студэнтаў Старшыня Савета Рэспублікі.

Яна падкрэсліла, што сёння краіна ўвайшла ў найважнейшы палітычны перыяд — зусім хутка надыдзе Адзіны дзень галасавання, потым, ускосным галасаваннем, будуць абраны члены Савета Рэспублікі, а затым сфарміраваны склад Усебеларускага народнага сходу ўжо ў якасці канстытуцыйнага органа з вялікімі паўнамоцтвамі. А ў наступным годзе — прэзідэнцкія выбары. У гэты час нельга заставацца ўбаку ад такіх лёсавызначальных для краіны падзей, трэба абавязкова прыйсці на выбарчыя ўчасткі і прагаласаваць.

Гаворачы пра электаральную кампанію, Наталля Качанава спынілася і на міжнародным становішчы, адзначыўшы, што вакол Беларусі штучна нагнятаецца напружанне: «Нас імкнуцца абвінавачваць у нейкай агрэсіўнай палітыцы. Але ж я гаварыла і гавару заўсёды, што мы міралюбівая краіна. Мір і спакой для нас — галоўнае, і, калі трэба, мы яго будзем абараняць. А як жа інакш — гэта наша краіна. І задача нашага пакалення — перадаць вам, маладым, гэтую мірную, спакойную, цудоўную краіну».

Таксама падчас сустрэчы Старшыня Савета Рэспублікі падрабязна расказала аб асаблівасцях работы верхняй палаты парламента і заканадаўчай улады ў цэлым, аб асноўных прынцыпах дзяржаўнага будаўніцтва. Спынілася яна і на сацыяльных гарантыях і дзяржаўнай дапамозе шматдзетным сем'ям, пенсіянерам, расказала пра змены ў падаткаабкладанні. Асабліва пры гэтым падкрэсліла: трэба цаніць тое, што мы маем, што пабудавалі. У тым ліку не толькі эканамічны, матэрыяльны складальнік дасягненняў, але і тыя магчымасці для развіцця, прафесійнага станаўлення і самарэалізацыі, якія створаны ў краіне. Гэта дарагога варта.

Але ж і ад чалавека залежыць нямала. Па словах Наталлі Качанавай, першае, што трэба для дасягнення мэт, — гэта працаваць. Адказна і добрасумленна. А па-другое, заўсёды захоўваць чалавечнасць і пачуццё справядлівасці. Асабліва калі ты на дзяржаўнай службе. Такую думку яна выказала, калі адказвала на пытанне — просьбу аб парадзе наконт паспяховага прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. Увогуле ж, пытанняў, як заўсёды, на сустрэчах Наталлі Качанавай было многа. І, як заўжды, іх тэматыка была надзвычай разнастайнай.

Падводзячы вынікі сустрэчы, Старшыня Савета Рэспублікі зазначыла: «...Я заўсёды з вялікай радасцю сустракаюся з маладзёжнай аўдыторыяй. Тым больш у такой цудоўнай ВНУ, як Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, вядучай ВНУ нашай краіны. І, вядома, мне сёння было вельмі цікава сустрэцца з хлопцамі і дзяўчатамі, гэта ў асноўным першы, другі і трэці курсы. Тыя, хто толькі пачаў вучыцца тут, многія з іх прыехалі з іншых гарадоў, рэгіёнаў... Перш за ўсё я агучваю тую інфармацыю, якой бы мне хацелася падзяліцца з імі. Расказаць аб той палітыцы, што праводзіцца ў нашай краіне, у тым ліку ў частцы маладзёжнай палітыкі. Аб тым, чым жыве сёння дзяржава, асабліва ў такі важны палітычны момант. Аб рабоце Савета Рэспублікі...

І, вядома, немалаважна было пачуць тыя пытанні, што цікавяць моладзь. Я кожны раз здзіўляюся той колькасці пытанняў, абсалютна розных. Яны датычацца і адукацыйнага працэсу, асабістага жыцця, нават просьбы параіць, як дасягнуць у жыцці ўсяго, аб чым марыць. Таму, зразумела, сустрэча надзвычай цікавая і карысная, і мы надалей прадоўжым такую практыку. Пры такіх асабістых сустрэчах каторы раз пераконваешся: у нас цудоўная моладзь, якая думае пра будучыню сваёй краіны. Мы ўпэўнены: яны зробяць усё дзеля таго, каб развіваць і прымнажаць тыя традыцыі, якія ёсць у нашай роднай Беларусі».

*(Аб чым яшчэ гаварылі на сустрэчы — у найбліжэйшым выпуску «Мясцовага самакіравання».)*

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

Медыясфера

# НА ВАСТРЫІ АРМЕЙСКАГА ЖЫЦЦЯ

## Міністры абароны і інфармацыі ўзнагародзілі журналістаў

**Сярод лаўрэатаў штогадовага творчага конкурсу на найлепшае асвятленне ў СМІ пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Беларусі, патрыятычнага выхавання насельніцтва — рэдактар аддзела газеты «Звязда» Вераніка КАНЮТА.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Журналіст адзначана дыпломам першай ступені ў намінацыі «Спецыяльны праект». На працягу многіх гадоў рэдакцыя «Звязды» сумесна з Міністэрствам абароны ажыццяўляе выпуск праекта «Плацдарм», у якім асвятляюцца ключавыя падзеі беларускай арміі, расказваецца пра людзей у пагонах, будучых абаронцаў Айчыны.

Сярод лаўрэатаў — журналісты перыядычных выданняў, інфармацыйнага агенцтва, тэле- і радыёканалаў. У конкурсе прымалі ўдзел супрацоўнікі як рэспубліканскіх, так і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі. Сёлета на конкурс было пададзена 83 заяўкі.

Як адзначыў падчас цырымоніі ўзнагароджання **міністр абароны Віктар ХРЭНІН**, ва ўмовах няпростай ваенна-палітычнай абстаноўкі, калі супраць нашай краіны, па сутнасці, развязана інфармацыйная вайна, беларускія журналісты знаходзяцца на перадавой, абараняючы інтарэсы Радзімы. Па словах кіраўніка абароннага ведамства, з гэтай задачай прадстаўнікі масмедыя спраўляюцца годна і прафесійна.

Па словах **міністра інфармацыі Уладзіміра ПЯРЦОВА**, шырокі ўдзел журналістаў у конкурсе сведчыць аб тым, што тэматыка, якая заключаецца ў аповедзе аб людзях у пагонах, сапраўдных патрыётах нашай краіны, становіцца ўсё больш папулярнай для чытачоў, гледачоў і слухачоў, а таксама запатрабаванай у рэдакцыйнай палітыцы СМІ.

«Самае галоўнае, што ў год, калі мы адзначаем 80-годдзе вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, гэтая тэма не сыходзіць з экранаў нашых тэлеканалаў, старонак газет, не знікае з радыёэфіру», — звярнуў увагу кіраўнік інфармацыйнага ведамства. Уладзімір Пярцоў заўважыў, што аўдыторыя СМІ, асабліва моладзь, у многім упершыню адкрывае для сябе няпростую гісторыю нашай краіны, даведваецца аб подзвігу, які цаной свайго жыцця здзейснілі нашы дзяды і прадзеды.

# ГАТОЎНАСЦЬ НУМАР АДЗІН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але кожны ведае, наколькі важнае гэта мерапрыемства, і адрэпеціраваць свае абавязкі яшчэ раз лішнім не будзе. У сувязі з гэтым у гімназіі праводзяцца трэнінгі, на адным з якіх пабывалі акрэдытаваныя ў адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам назіральнікі. Яны таксама пажадалі ацаніць ступень гатоўнасці ўчастка да значнай палітычнай падзеі. Члены камісіі правялі ў іх прысутнасці працэс апячатвання урны, абмяркоўвалі, як будзе ажыццяўляцца датэрміновае галасаванне, а таксама працэдура падлікаў галасоў і нявыкарыстаных бюлетэняў.

— Мы аформілі залу ў адпаведнасці з усімі рэкамендацыямі акруговай выбарчай камісіі, — удакладняе старшыня ўчастковай камісіі. — Забяспечана безбар'ернае асяроддзе, устаноўлены пандусы. На бачным месцы знаходзіцца інфармацыя пра тое, што гэта адзіны дзень галасавання і ўпершыню кандыдаты ў дэпутаты абіраюцца адразу па трох узроўнях — у Палату прадстаўнікоў, у абласны і гарадскі Саветы дэпутатаў.

На стале пры ўваходзе ў пакой — дэзсродкі і аднаразовыя маскі. Меры бяспекі ў складаны эпідперыяд ніхто не адмяняў. Па ходзе руху — стэнды з біяграфічнымі данымі кандыдатаў, у зоне дасягальнасці падрыхтаваныя для азнаямлення Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь на трох мовах, Выбарчы кодэкс і памяткі.

— Усім выбаршчыкам, якія сёлета ўпершыню прымаюць удзел у такім адказным мерапрыемстве, будзем уручаць Асноўны Закон Беларусі ў падарунак, — каментуе Міхаіл Якубук. — А такіх у нас 336 чалавек.

Для галасавання прадугледжаны тры кабінкі. Адна з іх — для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Яна шырэйшыя па памерах, каб было дзе развярнуцца на калясцы, а стол для зручнасці зроблены крыху ніжэй.

— Кабінкі адпавядаюць нормам па шырыні і вышыні, — заўважае Міхаіл Якубук. — У кожнай на стале памятка па запаўненні бюлетэня і папераджальная інфармацыя, што відэа- і фотаздымка забаронены. За гэта прадугледжана адказнасць.

Участак забяспечаны камп'ютарам, аргтэхнікай, сейфам, стацыянарным тэлефонам, счытвальнікам для ID-карт. Выбаршчыкаў з біяметрычнымі пашпартамі становіцца ўсё больш. Да паслуг грамадзян са слабым зрокам — лупы і трафарэты.

Магчыма, хтосьці пажадае азнаёміцца з падрабязнасцямі асвятлення электаральнай кампаніі ў краіне і захоча пагартаць мясцовыя або рэспубліканскія перыядычныя выданні. Калі ласка! Яны ляжаць на палічках у шафе. Побач з карыснай літаратурай.

— Прынцыпова новага нічога не з'явілася, — рэзюмуе Міхаіл Якубук. — Існуе цалкам адпрацаваная схема, і мы яе прытрымліваемся. Адзінае, што памянялася, — гэта падыход у афармленні кабінак для галасавання. Пажадана, каб сцэнкі ў іх былі белага або малочнага колеру, а шторы — чырвонага.

Да датэрміновага галасавання ўжо падрыхтавана празрыстая урна для бюлетэняў. У асноўны дзень іх для зручнасці і большай праходнасці на ўчастку будзе дзве. Для грамадзян сталага ўзросту і тых, хто ў сувязі з захворваннем не зможа наведаць участак, прадугледжаны дзве пераносныя скрыні.



— На 15 лютага трое жыхароў ужо выказалі жаданне прагаласаваць дома, — інфармуе суразмоўнік. — Калі пачнецца датэрміновае галасаванне, народ яшчэ больш актывізуецца.

А 25 лютага, непасрэдна ў Дзень выбараў, на ўчастку будзе не толькі ўрачыста, але і весела. Для выбаршчыкаў тут рыхтуюць змястоўную культурна-забаўляльную праграму і ўмовы для работы выязнога гандлю. Сваёй смачнай прадукцыяй народ будзе частаваць Магілёўскі мясакамбінат. Асноўная пляцоўка для галасавання размесціцца якраз паблізу ад актавай залы і гімназічнай сталовай. Дарэчы, чакаецца, што праз участак № 56 за час выбараў, у тым ліку і ў дні датэрміновага галасавання, пройдзе болей чым 1700 чалавек.

### ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

• Усяго ў Магілёўскай вобласці створана 693 участкі для галасавання.

• У склад выбарчых камісій увайшлі 7280 чалавек. Гэта грамадзяне, якія добра ўжо знаёмы з Выбарчым кодэксам і былі вылучаны шляхам падачы заяў, ад грамадскіх або палітычных арганізацый, працоўных калектываў.

• На адзін дэпутацкі мандат у мясцовыя Саветы дэпутатаў Магілёўскай вобласці практычна па ўсіх акругах прэтэндуе па два кандыдаты ў дэпутаты. Гэта 3602 чалавекі на 1804 дэпутацкія месцы.

• За ходам выбараў у Магілёўскай вобласці будуць назіраць болей чым 5300 чалавек, акрэдытаваных пры выбарчых камісіях усіх узроўняў. Акрамя іх будуць працаваць яшчэ і міжнародныя назіральнікі.

### ВАЖНА!

Грамадзяне, якія зарэгістраваны па адным адрасе, а збіраюцца галасаваць па іншым, павінны да 24 лютага падысці на найбліжэйшыя ўчастковыя камісіі з пашпартам і дакументам, што пацвярджаюць факт пражывання на дадзеным выбарчым участку — гэта можа быць дакумент куплі-продажу або арэнды жыллёвага памяшкання, камандзіровачнае пасведчанне і гэтак далей — і іх унясуць у спіскі.

**Старшыня Магілёўскай абласной выбарчай камісіі Яўген АЛЕКСА:**

— Пры фарміраванні ўчасткаў для галасавання мясцовыя органы выканаўчай улады зыходзілі з таго, каб яны былі традыцыйныя і ў тых месцах, дзе ўжо існавалі. Каб людзі ведалі, як іх знайсці. Раней кандыдатаў у дэпутаты абіралі паасобна і краіна перманентна знаходзілася ў стане выбараў. Цяпер, у адпаведнасці з папраўкамі ў Канстытуцыю, адзіны дзень выбараў кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў і мясцовыя прадстаўнічыя органы будзе праходзіць у апошнюю нядзелю лютага. Асаблівасць у тым, што выбаршчык у Магілёве і Бабруйску атрымае тры віды бюлетэняў, каб прагаласаваць за кандыдата ў дэпутаты ў Палату прадстаўнікоў, аблсавет і гарсавет, а ў сельскай мясцовасці — чатыры, каб выбраць яшчэ і дэпутата ў сельсавет.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**